СУСТРЭЧЫ

# ПРЫГАЖОСЦЮ СЛОВА НАТАЛІЩА

**БРЭСТ. Паэтэса Таццяна ЯЦУК правяла некалькі творчых сустрэч у горадзе над Бугам.**



16 кастрычніка член Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса, перакладчык, лаўрэат шматлікіх літаратурных прэмій Таццяна Яцук правяла дзве творчыя сустрэчы ў

горадзе над Бугам: у Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага яна выступіла перад вучнямі ліцэя і супрацоўнікамі бібліятэкі, а пасля – падзялілася творчасцю з калегамі-філолагамі ў Брэсцкім абласным інстытуце развіцця адукацыі па запрашэнні кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры прафесійнага развіцця адукацыі Станіслава Рыгоравіча Рачэўскага.

Сустрэчы прайшлі цікава і карысна: у іх ходзе прэзентавалі кнігу, новы зборнік лірыкі Таццяны Яцук "Прага цішыні" (Мінск, “Беларусь”, 2025), гутарылі пра ролю паэзіі ў выхаванні моладзі, дзяліліся сваімі меркаваннямі і наталяліся прыгажосцю мастацкага слова.

Гучалі шчырыя апладысменты. Было шмат кветак, усмешак, сяброўскіх гутарак і цеплыні. На сустрэчы выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, уладальнік ордэна "Голуб міра" Зоя Капуста (Кулік). Госця з Нясвіжа, беларуская паэтэса, краязнаўца, радыёвядучая расказала пра маштаб фестывалю праваслаўнай літаратуры і музыкі “Богородице похвалу воспоём”, які па яе ініцыятыве прайшоў у Нясвіжскім замку 25-26 верасня 2025 года, падкрэсліла яго ролю і значнасць.

Падчас брэсцкіх выступленняў нашай калегі пацвердзіліся важныя назіранні і аксіёмы. Творчыя сустрэчы – гэта сустрэчы сапраўдных сяброў. Пакуль развіваюцца традыцыі мастацтва, лёс нашай Радзімы шчаслівы. Калі гучыць паэзія – натхнёная душа народа спявае.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** у Брэсце адбыліся выступленні члена СПБ, беларускай паэтэсы Таццяны Яцук. Кастрычнік 2025 года.





Паэтэса Таццяна Яцук (з правага боку) і бібліятэкар, член СПБ, празаік Ірына Фаміна (Брэст)





Традыцыйная аўтограф-сесія



Член СПБ, паэтэса Таццяна Яцук выступае ў Брэсце



Арганізатар міжнароднага фестывалю духоўнай творчасці “Богородице похвалу воспоём”, член СПБ Зоя Капуста (Кулік)






Таццяна Яцук і кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры прафесійнага развіцця адукацыі Станіслаў Рыгоравіч Рачэўскі





Пасля мерапрыемства ў Брэсцкім абласным інстытуце развіцця адукацыі